# ДАСЛЕДАВАННІ ЛАКАЛЬНЫХ КУЛЬТУР І СУЧАСНЫ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС

Калацэй В. В.

## НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЗАХАВАННІ ФАЛЬКЛОРУ І ЭТНАКУЛЬТУРНЫМ ВЫХАВАННІ

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Працэс этнакультурнага выхавання на Беларусі сёння ўсё яшчэ мае месца пры так званай *«нефармальнай»* адукацыі (не знітаванай з фармальна арганізаваным навучальным працэсам) — проста пры сумесных з боку дзяцей працы, адпачынку, узаемадачыненнях у межах сваяцкіх груп са старэйшымі носьбітамі этнічнай культуры. Сёння беларускія дзеці яшчэ могуць навучыцца, як сябе паводзіць у час «Жаніцьбы Цярэшкі», «Ваджэння Стралы», як заправіць кросны ці сплесці пас «на дошчачках», хлопцу запрасіць дзяўчыну на танец, а дзяўчыне даць на яго згоду. Гэта магчыма без звяртання да відэаархіваў і да парадаў педагогаў-прафесіяналаў. Яны таксама маюць магчымасць засвоіць іншыя «грамадскакарысныя» (калі звяртацца да класічнай дэфініцыі адукацыі) стандарты паводзін, якія «этнакультурна» афарбаваны ў самым шырокім сэнсе: ад прыёмаў арганізацыі свайго працоўнага дня і самаабароны да паводзіннай этыкі ва ўзаемадачыненнях са старэйшымі паважанымі асобамі. Нікаму не забаронена лічыць, што тое, што яны такім чынам набудуць — *не горшае* за тыя нормы, якія сёння значна больш актыўна засвойваюцца праз відэа-, тэлепраграмы, Інтэрнет і стасункі ва ўрбанізаваных вулічна-падлеткавых асяродках. Асноўнай пляцоўкай «этнакультурна» афарбаваных адносін яшчэ (як і шмат часу таму) застаецца наша вёска, сведчаннем чаму з'яўляецца існаванне ў краіне дзіцячых этнаграфічных фальклорных гуртоў.

Натуральна, што з шэрагу прычын пляцоўкай этнакультурна-выхаваўчых працэсаў апошняга трыццацігоддзя ўсё часцей становяцца асяродкі адукацыі *«фармальнай»* (установы са спецыяльна арганізаваным навучальным працэсам): дзіцячыя садкі, школы, сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы, і знаходзячыеся «на мяжы» фармальнай і нефармальнай адукацыі ўстановы пазашкольнага навучання і выхавання. На гэта паўплывала шмат акалічнасцей: ад створаных былых са-

вецкіх клішэ пра «народную» дзіцячую аматарскую творчасць да свядомых памкненняў маладых педагогаў, чыя адукацыя і спробы самавыяўлення падпалі пад паслясуверэнітэтную рэчаіснасць. Формы адукацыйнага працэсу ў такіх асяродках: гуртковая праца, канцэртныя выступы, фестывальны рух. Апошнім часам з’явіліся разнастайныя новыя формы: ад адпраўлення народных святаў у школьных будынках да мэтанакіраваных выездаў вучняў дзеля гэтага ў натуральны ландшафт на прыроду. Варта дадаць да змен апошняга часу ў практыцы этнакультурнага выхавання і профільныя летнікі, якія арганізуюць супрацоўнікі гэтых жа ўстаноў, але па адмысловых, збольшага недзяржаўных праектах, па замовах грамадскіх аб’яднанняў.

Дзейнасць такіх устаноў даволі падрабязна рэгламентуецца шэрагам нарматываў, пералік якіх з цягам часу не памяншаецца. Акрамя афіцыйных дзяржаўных законаў, сюды магчыма аднесці: дзяржаўныя праграмы, у якіх «дэкларуюцца» прыярытэтныя напрамкі, у якіх павінны ладзіць сваю прафесійную дзейнасць усе дзяржаўныя служачыя галіны; нарматыўныя палажэнні пра адукацыйныя ўстановы, нейкія іх структурныя часткі (пра дэпартаменты, аддзелы, навучальныя групы — студыі, гурткі, клубы), навучальныя праграмы, што рэгулююць чаму і як у гэтых установах і асяродках вучыць. Калі зрабіць самы адвольны, непадрабязны агляд, найбольш вартымі ўвагі падаюцца наступныя цытаты і вытрымкі з такіх дакументаў.

На сёння ў Мінску існуе толькі адзін беларускамоўны дзіцячы садок, таму з далучэннем дзіцяці да каранёвай культуры ва ўзросце 1,8 — 6 год існуюць моцныя праблемы. Аднак, канцэптуальная для дзіцячых цэнтраў і дамоў творчасці, дзе дзеці могуць у гэтым узросце далучыцца да фальклору «Праграма развіцця ўстаноў пазашкольнага выхавання і адукацыі», зацверджаная загадам Міністэрства адукацыі № 504 ад 26.12.2000 г. дэкларуе, што: «Установы пазашкольнай адукацыі і выхавання з’яўляюцца сёння амаль самым дэмакратычным інстытутам навучання, адукацыі і выхавання, які прапаноўвае маладой генерацыі самыя разнастайныя паслугі інтэлектуальнага, аздараўленчага і рэкрэацыйнага характару. Яны забяспечваюць не толькі *роўныя магчымасці па далучэнні* дзяцей да *розных адгалінаванняў* свабоднай творчай дзейнасці, але даюць сапраўдныя і дыферэнцыраваныя магчымасці для іх духоўнага і творчага развіцця. Установы пазашкольнай адукацыі і выхавання сёння — гэта не толькі цэнтры дасугу дзяцей. У іх адукацыйна-культурных асяродках ***фарміруецца асоба, што свабодна самавызначае сябе*** ў гуманістычных відах развіваючай дзейнасці».

На ўзроўні рэспубліканскіх органаў кіравання існуе шэраг дакументаў, дэкларуючых дзяржаўную падтрымку каранёвай беларускай культуры. Так «Дзяржаўная праграма па захаванні і падтрымцы народнага мас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тацтва, народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь», зацверджаная загадам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за № 05/239 ад 28.12.2000 г., паведамляе, што: «Дзяржаўная праграма па захаванні і падтрымцы народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў» падрыхтавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь», даручэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Структура праграмы распрацавана ў адпаведнасці з перспектыўнымі накірункамі дзейнасці па захаванні і падтрымцы народнага мастацтва, рэкамендацыямі ЮНЭСКА «Аб захаванні фальклору» (лістапад 1989 г., XXV сесія Генеральнай канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры).

*Раздел III. Вывучэнне народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў, каардынацыя навукова-даследчай дзейнасці ў гэтай галіне.*

Правядзенне навуковага даследавання «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы зместу, форм і метадаў падрыхтоўкі педагагічных кадраў па засваенні традыцыйнай культуры».

Правядзенне навукова-практычнага даследавання «Этнаграфія дзяцінства».

Распрацоўка комплекснай міжведамаснай праграмы «Традыцыйная культура і дзеці».

*Раздел IV. Фарміраванне тэарэтыка-метадалагічнай базы для падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў.*

Правядзенне рэспубліканскага конкурсу аўтарскіх вучэбна-выхаваўчых праграм па розных накірунках традыцыйнай культуры.

Распрацоўка, апрабацыя і ўкараненне вучэбна-выхаваўчых праграм розных узроўняў і форм навучання па відах і жанрах традыцыйнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў, удасканаленне і перапрацоўка існуючых праграм (дашкольнае выхаванне, школьная, пазашкольная, сярэднеспецыяльная, вышэйшая адукацыя, павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўка кадраў, паслядыпломная адукацыя).

Падрыхтоўка серыі вучэбных дапаможнікаў, падручнікаў па розных відах і жанрах народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў.

Распрацоўка для ўстаноў культуры і адукацыі бібліяграфічных паказальнікаў па праблемах засваення традыцыйнай культуры ў культурнаасветным і вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Аўтаматызацыя сродкаў навучання традыцыйным рамёствам і промыслам Беларусі (стварэнне навучальных камп'ютэрных праграм па відах традыцыйных рамёстваў Беларусі).

Адкрыццё адзяленняў па традыцыйнай культуры ў дзіцячых школах мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Раздзел V. Папулярызацыя каштоўнасцей народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў.*

Нацыянальны фестываль рэгіянальнага фальклору (па кругавой сістэме — штогод у адной з абласцей).

Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі «Берагіня» (Гомельская вобласць, г. п. Акцябрскі — раз у два гады).

Рэспубліканскі фестываль беларускага народнага танца «Беларуская полька».

Стварэнне відэафільмаў аб правядзенні найбольш значных фестываляў і свят.

Стварэнне на беларускім радыё і тэлебачанні (рэспубліканскім і абласным) спецыяльных цыклавых перадач, прысвечаных беларускай традыцыйнай культуры.

*Раздзел VI. Удасканаленне нарматыўна-прававой базы ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў.*

Распрацоўка і зацвярджэнне Палажэння аб школах народнай творчасці.

Унясенне прапаноў па змяненнях і дапаўненнях у Палажэнне аб школах мастацтваў (з мэтай дазволу на выкладанне носьбітам фальклору, знаўцам мясцовых традыцый, якія не маюць вышэйшай і сярэднеспецыяльнай адукацыі)».

Тое, што навукоўцы завуць этнакультурным выхаваннем, часткова ўкладаецца ў эстэтычную адукацыю дзяцей і моладзі, што павінна цікавіць у роўнай ступені і сістэму адукацыі, і сістэму культуры. Пастанова сумеснай калегіі Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб эстэтычнай адукацыі навучэнскай моладзі», зацверджаная Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам культуры 27.06.2002 г. за № 6/7 вызначыла наступныя прыярытэты дзейнасці для ўстаноў краіны.

п. 8. Нацыянальнаму цэнтру творчасці дзяцей і моладзі:

п. 8.1. прадугледзець у планах работы комплекснае вывучэнне вопыту эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі...

п. 8.3. сумесна з органамі культуры... развіваць шматлікія віды самадзейнай творасці ... стымуляваць работу фальклорных ансамблей і аб'яднанняў па зборы ўзораў народнай творчасці, прапагандзе народнага мастацтва сярод дзяцей і падлеткаў;

п. 8.4. сумесна з упраўленнямі адукацыі, культуры аблвыканкамаў і Камітэтам па адукацыі і справах моладзі Мінскага гарвыканкама штогод праводзіць рэгіянальныя і рэспубліканскія агляды-конкурсы самадзейных калектываў па розных накірунках мастацкай творчасці;

п. 9. Упраўленням адукацыі, культуры абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, Камітэту па адукацыі і справах моладзі Мінскага гарвыканкама:

п. 9.3. Развіваць шматлікія віды самадзейнай творчасці. Стымуляваць работу фальклорных ансамбляў і аб'яднанняў па зборы ўзораў народнай творчасці, прапагандзе народнага мастацтва сярод дзяцей і падлеткаў. Разгарнуць лекцыйную работу, абмен вопытам, дыскусіі па пытаннях эстэтычнага выхавання».

*«Фольклорный ансамбль: Программа детского кружка»* // Музыка: Программы для внешкольных учрежденій. М.: Просвещение, 1985.

Сучасны фальклорны ансамбль вывучае і прапагандуе *сапраўдныя* творы народнай творчасці, выконвае іх у народна-спеўным стылі, які *адрозніваецца* ад акадэмічнага...

Музычнае выхаванне ўдзельнікаў фальклорнага ансамбля павінна арыентавацца *перадусім на фальклор роднага краю.* Музычны матэрыял будзе блізкі дзецям таму, што ён знітаваны з маўленчай інтанацыяй, з усімі яе мясцовымі асаблівасцямі.

Добры народны спявак спявае не адмысловую вакальную «партыю», а песню цалкам так, як ён яе адчувае і разумее ў дадзены момант. Імправізацыя здзяйсняецца народнымі выканаўцамі ў межах *пэўнага традыцыйнага пеўчага стылю.*

У сувязі з гэтым кіраўнік дзіцячага фальклорнага ансамбля павінен займацца грунтоўным вывучэннем стылявых асаблівасцей народнай імправізацыі, пераймаючы гэтае ўменне ў народных спевакоў, аналізуючы запісы народных песень.

Творчыя практыкаванні абавязкова ўводзіць літаральна з першых урокаў. Вар'іраванне добра вядомых мелодый — адзін з найбольш дасціпных на першым этапе відаў вакальнай імправізацыіі.

Так, праспяваўшы дастатковую колькасць песень Бранскай вобласці з бурдонам і «гуканнем», рабяты лёгка «распаюць» аднагалосную мелодыю дадзенай вобласці.

Музычнае выхаванне ўдзельнікаў фальклорнага ансамбля зарыентавана на фальклор *свайго рэгіёна*, музычны матэрыял якога звязаны з мясцовымі асаблівасцямі...

...кіраўнік калектыву павінен глыбока вывучаць стылявыя асаблівасці народнай імправізацыі, *пераймаючы* гэта ўменне і манеру ў *народных* спевакоў, аналізуючы запісы народных песень.

Вялікую ўвагу ў дзіцячым калектыве трэба ўдзяляць пашырэнню музычнага кругагляду: *слуханне запісаў*, наведванне канцэртаў... Карыснай справай з'яўляецца ўдзел дзяцей у *экспедыцыйнай* рабоце.

*«Палажэнне пра гурток Установы адукацыі «Нацыянальны цэнтр творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь».*

Заняткі ў гуртках вядуць па тыпавых праграмах, якія распрацаваны Міністэрствам адукацыі, індывідуальным праграмам з улікам спецыфікі творчага накірунку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Камплектаванне гурткоў пачынаецца з сярэдзіны жніўня і спыняецца 10 верасня бягучага года. У залежнасці ад патрабаванняў праграм, гурткі маю быць арганізаваны на весь навучальны год: з 10 верасня па 31 мая. У час вакацый (канікул) гурткі працуюць па адмысловаму раскладу, у тым ліку з новым ці зменены складам удзельнікаў, на базе аздараўленчых летнікаў, установ, ЖЭСаў і да таго падобнае.

Кожны навучэнец можа займацца ў 1—3-х творчых аб'яднаннях.

У склад кожнага гуртка, які навучаецца па праграме першага года навучання павінна ўваходзіць 12—15 чалавек, а другі год і наступныя гады — не менш 8—10 чалавек.

У гуртках пазашкольнай установы адукацыі і выхавання займаюцца навучэнцы і студэнты розных тыпаў установ адукацыі, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці. У парадку выключэння ў пазашкольнай установе могуць займацца дзеці дашкольнага ўзросту, а таксама моладзь да 21 года.

Заняткі ў гуртах ладзяць як групавыя, так і індывідуальныя, у адпаведнасці з праграмай навучання.

Для дзяцей дашкольнага ўзросту заняткі ў гуртках ладзяць 35 хвілін, не больш 2-х акадэмічных гадзін на тыдзень; для дзяцей малодшага ўзросту 6—10 гадоў — у межах 4-х акадэмічных гадзін на тыдзень, сярэдняга школьнага ўзросту 11—13 гадоў — 6 акадэмічных гадзін на тыдзень; старэйшага ўзросту 14—18 гадоў і далей — 10—12 гадзін на тыдзень. Індывідуальныя заняткі з дзецьмі-інвалідамі 3 гадзіны 35 хвілін; індывідуальныя заняткі з вакалістамі — 1 гадзіна на 1 вучня на тыдзень; індывідуальныя заняткі па навучанню гульні на інструменце — 1 гадзіна на 1 вучня двойчы на тыдзень. Калі ладзяць заняткі даўжынёй больш чым адна гадзіна ў дзень і ў залежнасці ад іх нагрузкі, праз кожныя 45 хвілін заняткаў ладзяць перапынак 10—15 хвілін са сменай дзейнасці.

Як бачым, на паперы з далучэннем дзяцей і моладзі Беларусі да яе этнічнай спадчыны праблем не існуе. Жыццё, аднак, больш складанае, чым самая дакладна складзеная мадэль. Таму апошняе слова — за педагогам, выхавацелем, кіраўніком — кожным практыкам, хто непасрэдна займаецца гэтай справай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ